# Жывём і помнім



**Таццяна ПАДАЛЯК, кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

19 чэрвеня 1944 года гітлераўцы знішчылі вёску Дальва, зажыва спаліўшы 44 яе жыхароў – 29 дзяцей, 13 жанчын, 2 мужчын. Гэта была апошняя з 628 беларускіх «вогненных вёсак» Вялікай Айчыннай вайны, якія паўтарылі трагічны лёс Хатыні. На месцы спаленай вёскі жыццё так і не адрадзілася… 15 ліпеня 1973 года адбылося адкрыццё мемарыяла «Дальва». Дзяржаўнага фінансавання не было, так што ўзводзіўся помнік, як гаворыцца, «на грамадскіх пачатках». Ініцыятарам і «рухавіком» гэтай справы стаў Мікалай Гірыловіч – адзіны жыхар Дальвы, каму пашчасціла выжыць… Сведка трагедыі, ён быў перакананы, што Бог выратаваў яго, каб было каму расказаць аб злачынстве акупантаў і ўвекавечыць памяць пра аднавяскоўцаў. Гэтаму ён прысвяціў усё сваё жыццё.

Велічная постаць жанчыны-маці, да якой даверліва прытуліўся маленькі хлопчык. А за іх спінамі – чорныя, нібы абгарэлыя, бэлькі, што руйнавалі чалавечыя жыцці… Былая вясковая вуліца стала алеяй памяці: 44 бярозкі – напамін пра загінулых у страшным вогнішчы.

На месцы, дзе стаялі хаты, – своеасаблівыя зрубы з цэменту. У Дальве было 12 хат, але з-за недахопу сродкаў паказана ўсяго пяць. Перад зрубамі, на прыступках – лялька, гладыш, серп, скрыпка, клубок нітак… Тут жылі мірныя людзі!

У Дальве ўстаноўлены камень з тэкстам – нібыта спаленыя нацыстамі людзі просяць у нашчадкаў прабачэння, што не могуць гасцінна сустрэць у вёсцы:

*Спаліў нас вораг чэрвеньскай парою –*
*Дзядоў, жанчын, падлеткаў і дзяцей.*
*Даруйце, людзі добрыя, за тое,*
*Што вас не сустракаем як гасцей.*


**ПРА АЎТАРА**

ПАДАЛЯК Таццяна Уладзіміраўна.

Нарадзілася ў Мінску. Пасля заканчэння факультэта журналістыкі БДУ (1986) працавала ў раённым, шматтыражным друку. У 1989 годзе паступіла ў аспірантуру БДУ.

3 верасня 1991 года – выкладчык, старшы выкладчык, з лютага 1999 года – дацэнт факультэта журналістыкі БДУ.

З 1992 па 2012 год працавала ў газеце «Звязда»: карэспандэнт, рэдактар аддзела культуры, намеснік галоўнага рэдактара.

У 2009–2011 гадах – намеснік дырэктара па інфармацыйнай рабоце РУП «Дом прэсы» – кіраўнік Прэс-цэнтра.

Кандыдат філалагічных навук (1998), дацэнт (2004).

3 лістапада 2012 года – дактарант БДУ.

Аўтар манаграфіі, вучэбна-метадычнага дапаможніка, шэрагу кніг публіцыстыкі, шматлікіх навуковых, метадычных і публіцыстычных артыкулаў.


Створаны ў Дальве і музей. Устаноўлены і асвячоны праваслаўны крыж. Праведзена электрычнасць. Да мемарыяльнага комплексу «Дальва» вядзе дарога з асфальтавым пакрыццём: ад шашы Мінск – Віцебск гэта 5 км… Для захавання памяці аб роднай вёсцы М. Гірыловіч напісаў кнігу «Дальва – сястра Хатыні», буклет «Мемарыяльны комплекс «Дальва».

З успамінаў Мікалая Гірыловіча: «Нямецкі гарнізон стаяў у Плешчаніцах, а праз 8 км, у Акалова, пачыналася партызанская зона – туды ўваходзіла і Дальва. З лютага 1942 года ў нас не было фашысцкай улады, не было паліцаяў – толькі карнікі праходзілі ў маі 1943-га. Але тады не лютавалі… А ў 1944-м была вялікая карная экспедыцыя: немцы ішлі літаральна цэпам, нічога не пакідаючы на сваім шляху. Ад партызан мы даведаліся пра гэта яшчэ ў маі, калі пачыналі сеяць… 1 чэрвеня падышла брыгада «Народныя мсціўцы», усе вяскоўцы накіраваліся ў лес, да зямлянак, там ужо былі і жыхары іншых вёсак. Партызаны праз пару дзён адступілі. А дзесьці праз тыдзень вельмі нізка лятаў нямецкі самалёт-разведчык, нас убачыў… Немцы пагналі нас у Жардзяжжа, дзе быў перасылачны пункт. Там частку людзей пагрузілі для адпраўкі ў Германію, астатніх пагналі перад сабой на Бягомль – правяралі, ці не замініравана шаша. Ноччу ўдалося збегчы з зачыненага хлява, сталі прабірацца дадому. У Дальву прыйшлі ў пятніцу, 16 чэрвеня…

На досвітку 19 чэрвеня бацька павёў пасвіць каня, кіламетры за два ад вёскі. Маці разбудзіла мяне, каб падмяніў бацьку. Сонца толькі ўзыходзіла, мы з маці басанож

▶ Уладзімір Церабун за працай над скульптурай



ішлі па роснай траве, пакідаючы прыкметныя сляды. Як зараз помню – бацька з маці адыходзілі ў Дальву, таксама пакідаючы сляды на расе... Праз нейкі час пачуў выбух і аўтаматныя чэргі. Узяўся распутваць каня (ён быў спутаны жалезным путам), але не атрымалася. Пабег у вёску без каня – гэта мяне і выратавала, інакш бы апынуўся ў Дальве ў той момант, калі немцы рабілі сваю чорную справу... Я прыбег агародамі, праз жыта: дзверы ў хаце адчынены, лётае пух ад падушак, пабітае шкло. А на стале лыжкі раскладзены... Выбег з хаты – нікога навокал, толькі праз дым убачыў у канцы вёскі дзве крытыя машыны. Мусіць, думаю, забралі людзей. Але не, аднавяскоўцы ўжо дагаралі... У маёй памяці да гэтага часу жах таго страшнага чэрвеньскага дня, калі Дальва памірала – памірала пакутліва, цяжка... Яшчэ і назаўтра, і на дзясяты дзень над папялішчам стаяў густы цяжкі пах. Ветрам яго даносіла да блізкіх і далёкіх вёсак. Не даваў дыхаць гэты пах смерці і гора.

Дзесяць дзён і начэй ляжалі пад адкрытым небам спаленыя дальвінцы. Не маглі жывыя адразу выканаць свой хрысціянскі абавязак перад нябожчыкамі: акупанты адступалі на захад, аказваючы жорсткае супраціўленне... Толькі 29 чэрвеня, у другой палове дня, паказаліся нашы танкі. У Дальву прыйшлі жыхары суседніх вёсак, партызаны, каб пахаваць загінулых... А напярэдадні прайшоў дождж, размыў страшнае папялішча. Недалёка ад хаты, дзе былі спалены мае землякі, выкапалі брацкую магілу. Людзі асцярожна разбіралі чорныя галавешкі, знаходзілі пад імі і прыносілі ў вялізную драўляную скрыню астанкі загінулых дальвінцаў. Трупы пазнавалі па рэштках адзення, абутку. Наверх у скрыню паклалі абвугленых, чорных-чорных маю маці і брата... У хуткім часе былі пастаўлены тры драўляныя крыжы, розныя па вышыні: старэйшаму, сярэдняму і малодшаму пакаленням спаленых дальвінцаў».

*...І вось захлынуліся*
*Людзі ў тым дыме.*
*Спалілі забойцы*
*Вяскоўцаў жывымі.*

*Спалілі усіх –*
*Сарака чатырох.*
*А лёс аднаго хлапчука*
*Ўсё ж збярог!*
*(З паэмы Віктара Шымука «Дальва»)*

▼ Мітынг у Дальве. Сярэдзіна 1970-х гадоў



Сярод зажыва спаленых дальвінцаў павінен быў быць і 13-гадовы падлетак Коля Гірыловіч. Ён сапраўды цудам застаўся жыць. У агульнай магіле спяць яго самыя родныя людзі – мама і тата, тры малодшыя браты, дзядуля.

Аднойчы ў размове Мікалай Пятровіч, праз слёзы, узгадаў:

– Маці мая, мусіць, цяжарная была, так хацела нарадзіць дачушку... Маці і малодшы брацік ляжалі ў двары, метраў за дзе-

сяць ад агульнага чалавечага месіва. Мабыць, яны вырваліся з палаючай хаты, але немцы іх застрэлілі. Маці сваю я пазнаў не па твары – па каронцы ў роце: толькі ў яе была…

Ён застаўся зусім адзін.

У 1945-м, пасля заканчэння Астраўскай пачатковай школы, паступіў у Брэсцкае вучылішча сувязі, потым працаваў па спецыяльнасці і вучыўся ў вячэрняй школе рабочай моладзі. Пасля арміі скончыў Усесаюзны завочны электратэхнічны інстытут сувязі ў Маскве. З пачатку 1960-х працаваў у Белтэлерадыёкампаніі – інжынерам, начальнікам апаратна-студыйнага комплексу. Шмат зрабіў для развіцця і тэхнічнага ўдасканалення радыёвяшчання рэспублікі, невыпадкова М.П. Гірыловічу прысвоена ганаровае званне «Заслужаны сувязіст Беларусі».

…Пасля службы ў арміі восенню 1954 года Гірыловіч прыехаў у родныя мясціны. Пайшоў да брацкай магілы аднавяскоўцаў і ўбачыў… разбурэнне і заняпад. Адзін з драўляных крыжоў паваліўся, агароджа пакасілася. Трэба было прымаць тэрміновыя меры. З дапамогай Прусевіцкага сельсавета паставілі жалезную агароджу і бетоннае надмагілле.

А аднойчы, калі з жонкай Рымай Ігараўнай і дачкой Вольгай Мікалай Пятровіч прыехаў ускладці кветкі на магілу дальвінцаў, убачыў: малады трактарыст пераворвае агароды і… дальвінскую вуліцу – напамін аб трагедыі. Пра родную вёску і гэты выпадак ён напісаў артыкул у газету «Советская Белоруссия», і толькі тады знішчэнне было прыпынена. Ад кіраўніцтва саўгаса «Іскра» прыйшоў ліст з прабачэннем за тое, што здарылася, і просьбай узнавіць прозвішчы, імёны, імёны па бацьку і ўзрост спаленых дальвінцаў. У 1963 годзе на месцы пахавання быў устаноўлены абеліск.

Калі 30 чэрвеня 1969 года адкрывалі мемарыяльны комплекс «Хатынь», М. Гірыловіч прывёз дальвінскую зямлю на Могілкі Вёсак. Менавіта тады і прыйшло рашэнне пабудаваць мемарыял на месцы знішчанай роднай вёскі. Ініцыятыву Мікалая Пятровіча падтрымала шырокая грамадскасць краіны. Асабліва важкім быў уклад калег з Белтэлерадыёкампаніі. Творчыя калектывы выступалі з канцэртамі, заробленыя сродкі пералічалі на спецыяльны рахунак Лагойскага райкама камсамола. Студэнты і школьнікі працавалі ў калгасах і саўгасах, збіралі дары прыроды – выручаныя сродкі таксама накіроўвалі для ўзвядзення мемарыяла. Маладыя людзі, якія ўжо не помнілі вайну, і тыя, хто нарадзіўся пасля Перамогі, збіралі сродкі, стваралі праект мемарыяла і працавалі на яго ўзвядзенні. Школьнікі, студэнты, працоўная моладзь, вайскоўцы…

Наконт стварэння самога мемарыяла М. Гірыловічу параілі звярнуцца ў тэатральна-мастацкі інстытут на аддзяленне скульптуры. Там вельмі ўважліва паставіліся да ідэі ўшанаваць памяць загінулай вёскі. На 3-м курсе быў абвешчаны адпаведны творчы конкурс. А калі падводзілі яго вынікі, выкладчыкі інстытута знакамітыя

## МЕРКАВАННЕ



**Артур ЗЕЛЬСКІ, дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», кандыдат гістарычных навук:**

– З 1993 года мемарыял «Дальва» з'яўляецца філіялам Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», а з 2004 года адміністрацыйна падпарадкоўваецца Мінскаму абласному выканаўчаму камітэту. За апошні час на мемарыяле, акрамя бягучага рамонту, былі праведзены вялікія рэстаўрацыйныя і рамонтныя работы. Пачалося з рамонту будынка музея і стварэння якасна новай экспазіцыі. Пасля, у 2009 годзе, былі ўладкаваны дарожкі да мемарыяла, адрамантаваны пляцоўка перад помнікам і «Сцяна памяці». Наступным этапам стала прывядзенне ў належны стан цэнтра мемарыяла, бо за мінулыя дзесяцігоддзі ад уздзеяння сіл прыроды скульптура «Маці і дзіця» была моцна пашкоджана. Гэты пранізлівы помнік дальвінскай трагедыі быў адрэстаўраваны ў 2010 годзе. У наступныя гады было заменена пакрыццё сімвалічнай вуліцы – апошняга шляху дальвінцаў. У час рамонтных работ высветлілася: пад бетоннымі плітамі, што парэпаліся і руйнаваліся, знаходзіліся фрагменты рэшткаў старога бруку вясковай вуліцы. Замест яго была пакладзена плітка, што імітавала брукаванае пакрыццё. Адначасова, у 2012 годзе, праводзіўся рамонт сімвалічных вянкоў хат. Пры самым дзейсным удзеле скульптара У.В. Церабуна адноўлены сімвалічныя скульптурныя знакі на прыступках хат. Не лічачы штогадовага абслугоўвання комплексу, за перыяд 2009–2012 гадоў былі выкананы работы на агульную суму звыш 367,5 млн беларускіх рублёў.



▶ М.П. Гірыловіч у Дальве

скульптары Андрэй Бембель і Анатоль Анікейчык прапанавалі Мікалаю Пятровічу: «Выбірайце, які праект больш падыходзіць: вы ж галоўны заказчык». Спадабалася работа Валодзі Церабуна – і кафедра зацвердзіла менавіта гэты праект.

Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь скульптар Уладзімір Церабун успамінае:

– Калі ўзводзіўся помнік у лесе, дзе няма побач ні хат, ні людзей, то тады, яшчэ студэнтам, я думаў: навошта людзі будуюць помнік у лесе, хто тут будзе яго бачыць – юнацкая такая думка, разумееце… Але да справы ставіўся вельмі сумленна, гэта ж была мая першая вялікая работа, дый трэба было апраўдаць давер кафедры. Два леты на студэнцкіх канікулах (агулам 7 месяцаў) я там жыў і працаваў. Помню, наколькі свята людзі адносіліся да гэтай будоўлі.

Помнік у Дальве стаў дыпломнай работай Уладзіміра Церабуна – адметнай і таленавітай. Дарэчы, гэта быў першы выпадак у гісторыі інстытута, калі дыпломная работа скульптара выконвалася ў натуры на месцы. І Дзяржаўная экзаменацыйная камісія выязджала ў Дальву – там і адбывалася абарона дыплома. За гэтую работу ў 1976 годзе скульптар У. Церабун быў узнагараваны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі.

Мемарыяльны комплекс «Дальва» будаваўся і два дзесяцігоддзі існаваў «на грамадскіх пачатках». З 1993 года «Дальва» з'яўляецца філіялам Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Гэта лагічна: вёскі аднаго лёсу, дый ад Хатыні да Дальвы і сапраўды рукой падаць, у Лагойскім (былым Плешчаніцкім) раёне іх аддзялялі ўсяго пару дзясяткаў кіламетраў. Рашэннем Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ў 2002 годзе мемарыяльны комплекс «Дальва» ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Соф'я Емяльянаўна Такарэўская доўгі час даглядала мемарыяльны комплекс. З суседняй вёскі яна прыходзіла ў Дальву як дадому: яна таксама дальвінка, тут нарадзілася-гадавалася. Выжыла ў вайну, таму што ў чэрвені 1944 года з перасылачнага пункта ў Жардзяжжы яе вывезлі ў Германію. Атрымліваецца: пашанцавала… У агні загінулі тры яе сястры, брат і мачаха. А бацька, Гунько Емяльян Пятровіч, у той дзень працаваў на полі, таму і застаўся жывы. У канцы 1944-га пайшоў на фронт, загінуў ва Усходняй Прусіі.

«Дзякуй Гірыловічу, калі б не ён – нічога тут не было б, травой бы парасло», – гаварыла Соф'я Емяльянаўна. Сімвалічна, што за 4 дні да раптоўнай смерці ў 2006 годзе Мікалай Пятровіч яшчэ раз прыехаў у Дальву, прысеў на месцы, дзе была родная хата.

Ён паспеў вельмі многае за сваё жыццё – нібыта жыў не толькі за сябе, але і за землякоў, якія з Нябёсаў слалі яму сваё блаславенне.

*З людзьмі спалілі тваю Дальву,*
*што паўтарыла лёс Хатыні.*
*Зрабіў ты ўсё, каб мы ніколі*
*пра тое гора не забылі…*

Гэтыя паэтычныя радкі Ульяна Церабуна – роднага брата скульптара, што стварыў дальвінскі мемарыял, прысвечаны М. Гірыловічу, які сапраўды здзейсніў вялікі грамадзянскі і сыноўскі подзвіг. Гавару пра гэта з поўным правам, таму што з сярэдзіны 1990-х гадоў, курыруючы ваенна-патрыятычную тэматыку ў газеце «Звязда», я вельмі цесна кантактавала з Мікалаем

Пятровічам Гірыловічам. Газета аказвала інфармацыйную падтрымку, садзейнічанне ў высакароднай справе захавання памяці: увесь час мемарыяльны комплекс «Дальва» працягваў дабудоўвацца і развівацца. Быў адкрыты дабрачынны рахунак для збору ахвяраванняў на рэканструкцыю мемарыяла. Тады яшчэ ў Дальве не было ні музея, ні асвятлення, ні асфальтаванай дарогі ад шашы… Паступова, намаганнямі Гірыловіча, вырашаліся пытанні, якія здаваліся «непад'ёмнымі». Толькі адзін прыклад: на працягу 30 гадоў немагчыма было вырашыць праблему асвятлення Дальвы: у мемарыяле не запальвалася ніводнай лямпачкі. У 2004-м была дасягнута чарговая (зусім немаленькая!) перамога: пракладзена 1,6 км лініі электраперадач…

Рыма Ігараўна Гірыловіч, жонка і аднадумец Мікалая Пятровіча, працягвае сістэматызаваць велізарны архіў мужа, каб перадаць дакументы ў Лагойскі архіў і краязнаўчы музей, у музеі мемарыяльных комплексаў «Хатынь» і «Дальва». Дакументы, перапіска з самымі рознымі інстанцыямі аб аказанні садзейнічання ў праблемных пытаннях (тут сабрана ўся гісторыя стварэння мемарыяльнага комплексу «Дальва»!), фотаздымкі, газетныя і часопісныя «дасье»…

У асобных вялікіх папках – шматлікія копіі дакументаў, якія М. Гірыловіч выявіў, на працягу многіх гадоў працуючы ў Нацыянальным архіве Беларусі. Яму ўдалося аднавіць усю гісторыю Дальвы. Аказваецца, вёска ў гістарычных крыніцах згадваецца яшчэ ў канцы XVII стагоддзя. Калісьці ў гэтых мясцінах быў дрымучы лес, які складаў адно цэлае з Бярэзінскім запаведнікам. Ад Дальвы лес адступіў на адзін-два кіламетры. У архіўных дакументах пазначана, што ў 1804 годзе Раймунд Палевіч купіў фальварак у памешчыкаў Каверскіх. Да гэтага маёнтка адносіліся вёскі Дальва, Рубеж і Бытнова. Пасля смерці Раймунда маёнтак і сядзібу атрымаў у спадчыну яго сярэдні сын Альфонс. А ў канцы XVIII стагоддзя маёнтак перайшоў сваяку Мельхедру Стафановічу…

І яшчэ дэталь: побач з «дальвінскімі» матэрыяламі я ўбачыла надзвычай цікавыя дакументы – пасведчанне 1994 года аб тым, што М.П. Гірыловіч з'яўляецца даверанай асобай кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі і падзячнае пісьмо за подпісам Прэзідэнта. За лёс краіны Гірыловіч перажываў усім сэрцам…

Адна з новых вуліц Лагойска атрымала імя ганаровага грамадзяніна горада Мікалая Гірыловіча. За апошнія гады істотна абнавіўся мемарыяльны комплекс «Дальва». Працягваюць жыць іншыя патрыятычныя праекты, якія нарадзіліся ў няўрымслівым сэрцы адзінага сведкі знішчэння вёскі Дальва.

Штогод у дзень трагедыі ў мемарыяле праходзіць Акцыя Памяці, мітынг-рэквіем з удзелам кіраўніцтва, грамадскасці, школьнікаў і моладзі Мінскай вобласці і Лагойскага раёна, былых калег М. Гірыловіча – членаў ветэранскай арганізацыі Белтэлерадыёкампаніі, прадстаўнікоў Мінскага абласнога аддзялення Беларускага фонду міру. Святарамі Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора праводзіцца памінальнае богаслужэнне. Яшчэ адно знакавае мерапрыемства, што ладзіцца ўжо на працягу больш як 40 гадоў і стала добрай традыцыяй, – прымеркаваны да Дня абаронцаў Айчыны лыжны агітпрабег «Мінск – Хатынь – Дальва». У ім бяруць удзел школьнікі і студэнты беларускай сталіцы і Лагойшчыны, ваеннаслужачыя. Маладыя жыхары краіны сваім удзелам у гэтых стартах нібыта сцвярджаюць: ваеннае злачынства не павінна паўтарыцца нідзе і ніколі. Ёсць рэчы, пра якія нельга забываць.

Такім чынам, памяць жыве. Мы, беларусы, жывём – і помнім.

▼ М.П. Гірыловіч з удзельнікамі агітпрабегу

